УДК 94(476)

# Рэформы гарадскога самакіравання Беларусі ў 90-я гады XVIII стагоддзя

**© Стрэнкоўскі С.П.**
***Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі", Мінск***

*У артыкуле разглядаюцца змены, якія адбыліся ў структуры і функцыях самакіравання гарадоў Вялікага княства Літоўскага ў сувязі з правядзеннем рэформаў Чатырохгадовага сейма. Вызначаныя некалькімі канстытуцыямі, якія прынеслі істотныя змены ў жыццё беларускіх гарадоў. Упершыню з'явілася адзінае для ўсёй краіны гарадское заканадаўства, якое прыйшло на змену партыкулярызму магдэбургскага права. Былі ўсталяваны адзіныя правілы ўтварэння і функцыянавання інстытутаў гарадскога самакіравання. Больш дакладна размяжоўваліся напрамкі іх дзейнасці ў адміністрацыйнай, эканамічнай і судовай сферах. Змяняліся заканадаўчыя асновы судовага працэсу. Ажыццяўляўся новы адміністрацыйны падзел гарадоў на акругі і дазоры, утвараліся гарадскія аддзелы з цэнтрамі ў апеляцыйных гарадах. Пачалося пэўнае ўключэнне гарадскіх інстытутаў у агульную структуру ўлады Рэчы Паспалітай з акрэсленым абмежаваннем функцый у галіне кіравання і суда, падначаленнем іх дзяржаўным органам кіравання (камісія паліцыі, скарбовая камісія, асэсарскі суд). Пашырэнне правоў гараджан выклікала рост іх самасвядомасці. На канкрэтных прыкладах паказана рэалізацыя рэформаў у асобных беларускіх гарадах.*
***Ключавыя словы:*** *гарадское самакіраванне, магдэбургскае права, Вялікае княства Літоўскае, Чатырохгадовы сейм, магістрат, прывілеі, суд, войт, бурмістр.*

*(Ученые записки. – 2011. – Том 12. – С. 75–84)*

# Self-government reforms in Belarusian cities in the 90-s of XVIII century

**© Strenkovsky S.P.**
***State educational establishment "The City of Minsk Institute of the Development of Education", Minsk***

*The article examines the changes that occurred in the structure and functions of the self-government of the cities in the Grand Duchy of Lithuania in accordance with the reforms of the Four-year Sejm. Determined by several constitutions, they brought considerable changes in the life of Belarusian cities. It was the first urban legislation single for the whole country, which came to replace the particularism of the Magdeburg Right. Common rules for the creation and functioning of the city self-government institutions were established. Their activities in the administrative, economic and judicial spheres were more clearly delineated. Changes in a legislative framework of the judicial process also took place. A new administrative division of the cities into districts and watches was implemented, and city departments with the centers in appellate cities were created. The inclusion of urban institutions into the general structure of power of Rzecz Pospolita in accordance to certain limitation of functions in the sphere of the court management, subjecting them to public management bodies (the police, government commission, assessor court) started. The expansion of the rights of the citizens caused growth of their self-consciousness. Concrete examples show the implementation of the reforms in some Belarusian towns.*
***Key words:*** *city self-government, Magdeburg Right, Grand Duchy of Lithuania, Four-Year Sejm, magistrate, privileges, court, vogt, burgomaster.*

*(Scientific notes. – 2011. – Vol. 12. – P. 75–84)*

---

*Адрас для карэспандэнцыі:* пер. Бранявой, 15-А, 220034, г. Мінск,
*e-mail:* strenkovskii@minsk.edu.by – **С.П. Стрэнкоўскі**

Развіццё гарадскога самакіравання Беларусі ў канцы XVIII стагоддзя – пытанне, якое вельмі мала даследавана ў айчыннай гістарыяграфіі. Шэраг пытан-няў эвалюцыі магдэбургскага права і гарадскіх органаў улады разгледжаны ў працах М. Атрушкевіча [1, 2]. Узаемада-чыненні магістратаў і ваеннацывільных парадковых камісій даследаваў Ю. Гардзееў [3]. Прывілеі і вількеры беларускіх гарадоў названага перыяду разгледжаны ў манаграфіі С. Стрэнкоўскага [4]. У сучас-най літоўскай гістарыяграфіі рэфарма-ванне ўлады ў гарадах Літвы і часткова Беларусі ў 1788–1792 гадах разглядае ў сваёй манаграфіі Л. Глемжа [5]. Трэба адзначыць, што канец XVIII стагоддзя для Рэчы Паспалітай, як перыяд крызісу і разам з тым рэфармавання дзяржаўнага ладу, эканамічных і сацыяльных адносін, як час падзелаў гэтай дзяржавы, аказаў вялікі ўплыў і на развіццё гарадоў. Таму без дакладнага высвятлення зменаў, якія адбыліся ў структуры і змесце дзейнасці гарадскога самакіравання нельга атрымаць дакладнае ўяўленне аб стане гарадоў на пераломным этапе гістарычнага развіцця нашай краіны.

Менавіта ў гэты час этап стагнацыі гарадскога самакіравання паступова змяняецца наступным этапам – этапам заняпада [6]. Ён быў выкліканы агульным крызісам Рэчы Паспалітай, няўдалымі рэформамі і падзеламі дзяржавы і можа быць суаднесены з другой паловай 80-х – пачаткам 90-х гадоў XVIII стагоддзя, калі магдэбургскае самакіраванне перастала існаваць. Разам з тым трэба адзначыць, што бюракратычная арганізацыйная культура, у рамках якой яно развівалася ў гэты час, з'явілася адной з падстаў перараджэння яго ў гарадское кіраванне ў выглядзе адпаведнага гарадавога магістрата Расійскай імперыі. Але гэтае пераўтварэнне самакіравання пачалося ўжо ў апошнія часы Рэчы Паспалітай.

У дадзеным артыкуле мы не ставім перад сабой задачу даць усебаковы аналіз рэалізацыі гарадскіх рэформаў Чатырохга-довага сейма. Нашай мэтай з'яўляецца сістэматычнае выкладанне сутнасці сей-мавых канстытуцый, якія паклалі пра-вавую аснову гарадской рэформы, і аналіз першых крокаў яе рэалізацыі.

**Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі для вывучэння праблемы з'яўляюцца надрукаваныя ў XIX стагоддзі сеймавыя канстытуцыі Рэчы Паспалітай, змешчаныя ў зборніках Volumina Legum, а таксама актавыя кнігі магістратаў беларускіх гарадоў, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гіс-тарычным архіве Беларусі ў г. Мінску. Для рэалізацыі пастаўленай мэты намі выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (лагічны метад, аналіз, сінтэз, абагуль-ненне), так і спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як вядома, пэўныя рэформы гарадскога жыцця пачаліся ўжо ў 60-я гады XVIII стагоддзя. Аднак яны былі вельмі павярхоўнымі. Найбольшай паслядоўнасцю адрозніваюцца рэформы, якія праводзіў Чатырохгадовы сейм. У айчыннай гістарыяграфіі ў дачыненні да гарадоў рашэнні гэтага сейма зводзяцца ў асноўным да разгляду закона "Гарады нашы каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай" [7, с. 234–235]. Аднак быў прыняты цэлы пакет канстытуцый, якія датычы-ліся рэформаў гарадскіх паселішчаў: "Прынцыпы да праекта аб гарадах", "Гарады нашы каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай", "Унутра-нае ўладкаванне гарадоў вольных Рэчы Паспалітай у Кароне і ў Вялікім княстве Літоўскім", "Папярэджанне ад-носна ўвядзення права аб гарадах нашых, даўней каралеўскіх, а цяпер вольных Рэчы Паспалітай", "Уладкаванне гарадскіх судоў і асэсорыі", часткова "Устава ўраду", "Сеймікі", "Кніга зямянская", "Камісія паліцыі". Най-большае значэнне меў безумоўна прыняты 18

красавіка 1791 года закон "Гарады нашы каралеўскія вольныя" [8, с. 215–219]. Згодна з ім усе каралеўскія гарады абвяшчаліся вольнымі і для іх усталёўвалася адзінае гарадское права. Уся нерухомая маёмасць мяшчан гэтых гарадоў прызнавалася іх дзедзічным уладаннем, таму што самі мяшчане – "вольныя людзі".

Кароль пацвярджаў гарадам усе іх пры-вілеі. Прычым адзначалася, што тыя гара-ды, у якіх загінулі лакацыйныя прывілеі, пры пацвярджэнні іх былой наяўнасці атрымаюць аднаўленчыя ці рэнавацыйныя прывілеі (diplomata renovationis); гарады, ў якіх адбываюцца земскія сеймікі, могуць атрымаць лакацыйныя прывілеі, калі іх дагэтуль не мелі; паселішчы, заселеныя вольнымі людзьмі і маючыя выгляд горада, могуць атрымаць заснавальныя ці эрэк-цыйныя прывілеі (diploma erectionis); утвораныя прыватнымі ўласнікамі гарады пры ўмове надання ім зямлі могуць атрымаць канфірмацыйныя прывілеі (diploma confirmationis).

Усе абывацелі гарадоў, якія займаліся ў іх гандлем, абавязаны былі прыняць гарадское права, а менавіта: прынесці прысягу каралю, Рэчы Паспалітай і гораду і ўпісацца ў гарадскія кнігі, на іх рас-паўсюджвалася права асабістай неда-тыкальнасці neminem captivabimus. Гара-ды не павінны былі адмаўляць жадаючым стаць мяшчанамі ў прыеме.

Гарады па-ранейшаму маглі выбіраць магістрат, які быў судом першай інстанцыі, і карыстацца вольнасцямі. Браць удзел у выбарах і быць абранымі маглі ўсе гараджане, занесеныя ў гарадскія кнігі ўладальнікаў маёмасці. Аднак жа забаранялася сумяшчэнне гарадскіх пасад з земскімі і вайсковымі. Гарады маглі прымаць рашэнні па сваіх унутраных справах са згоды камісіі паліцыі. Скасоўваліся ў судовым і паліцэйскім плане юрыдыкі – іх жыхары падначальваліся ўласнікам толькі па падатковых пытаннях. Вызначаныя катэгорыі мяшчан маглі атрымаць шляхецтва. Ствараліся ўмовы для службы мяшчан у войску і земскіх установах.

Закон уводзіў апеляцыйныя суды, якія разглядалі справы, вырашаныя магістратамі гарадоў паісках, якія перавышалі 300 злотых і па асуджэннях звыш 3 дзён турмы, а ў першай інстанцыі – крымінальныя справы. Іх рашэнні аб вечным зняволенні і смяротным пакаранні зацвярджаў асэ-сарскі суд. Апеляцыйныя суды ў ВКЛ былі ў Вільні для Віленскага ваяводст-ва, Ашмянскага, Браслаўскага, Лідска-га, Вількамірскага і Трокскага паветаў; у Гродне для Гродзенскага, Ваўкавыс-кага і Мерацкага паветаў; у Коўне для Жмудзі і паветаў Ковенскага, Прэнска-га і Упіцкага; у Навагрудку для Нава-грудскага ваяводства, Слонімскага і Случарэцкага паветаў; у Брэсце для Брэсцкага ваяводства і Кобрынскага павета; у Пінску для Пінскага, Пінска-Зарэчнага, Мазырскага і Рэчыцкага паветаў; у Мінску для ваяводстваў Мінскага, Полацкага, Віцебскага і Аршанскага павета. Пад юрысдыкцыю магістратаў траплялі ўсе гараджане. Жыхары вольных і апеляцыйных гара-доў маглі пасылаць сваіх прадстаўнікоў на сейм, дзе яны маглі засядаць у якасці камісараў ці асэсараў у камісіях паліцыі і скарбовай, а таксама ў асэсорыі, у якіх мелі права рашаючага голасу па справах, што датычыліся гарадоў і гандлю, і дарадчага па іншых справах. Праз іх гараджане маглі дакладваць свае пытанні на паседжаннях сейма.

Канстытуцыя "Унутранае ўладка-ванне гарадоў" [8, с. 291–297] вызна-чала наяўнасць двух разрадаў мяшчан: уласнікаў маёмасці, якія запісваліся ў асобныя кнігі накшталт зямянскіх, і тых, што не мелі ўласнасці, а займаліся гандлем, рамяством ці якой-небудзь "гарадской прафесіяй" і заносіліся ў асобныя кнігі. Межы горада вызначаліся да "апошняга дома, якім заканчваецца прадмесце ці вуліца".

Нармаваліся палажэнні, якія датычы-ліся мэтаў і парадку дзейнасці гарадскіх сходаў. На іх збіраліся

занесеныя ў кнігі ўласнікаў, за выключэннем не дасяг-нуўшых 18 гадоў, раздаўшых маёмасць крэдыторам, знаходзячыхся пад следствам і на дзейснай службе ў войску па запра-шэнні магістрата. Сходы адбываліся ў ратушы ці месцы, вызначаным магіст-ратам, калі ратушы не было. У гарадах, меўшых да 500 уласнікаў, утвараўся адзін сход, ад 600 да 1000 – 2 сходы, ад 1000 да 1500 – 3 сходы. Кожныя 500 наступных уласнікаў прыводзілі да стварэння наступ-нага сходу. Частка горада, якая мела свой сход, называлася "акругай" (cyrkuł). Акругі і гарады, што іх не мелі, падзяляліся на "дазоры" (dozor), у якіх было ад 100 да 200 уласнікаў. Сходы ў акругах і гарадах, што іх не мелі, адбываліся з нагоды выбараў і зваліся "асаблівымі" (szczególny), у адрозненне ад агульных (ogólne) сходаў гарадоў, якія мелі акругі. Прадстаўнікі гарадоў, што ўваходзілі ў адзін апеляцыйны "аддзел" (wydział), утваралі сход аддзела.

Першараднай функцыяй кожнага сходу былі выбары службовых асоб. Усе сходы першапачаткова выбіралі дырэктара і 4 асэсараў, якія ажыццяўлялі правядзенне саміх сходаў. Асаблівыя сходы гарадоў таксама выбіралі войта і 4 радных у магістрат, бурмістра і 4 суддзяў у мясцовы суд, 4 лаўнікаў, касіра і дэпутатаў на сход аддзела (гарады да 100 уласнікаў – 1; ад 100 да 300 – 2; гарады і акругі ад 300 да 600 уласнікаў – 3). Асаблівыя сходы акругаў выбіралі войта і 6 лаўнікаў, бурмістра і 4 суддзяў у акружны суд, 12 гмінных на агульны сход і дэпутатаў на сход аддзела. Гмінныя на агульных сходах выбіралі прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта, радных (па 3 ад акругі ў гарадах, якія мелі да 3 акруг; па 2 у гарадах, што мелі больш за 3 акругі) у магістрат і касіра. Сход аддзела выбіраў упаўнаважанага (plenipotent) на сейм, 5 апеляцыйных суддзяў і 5 іх на-меснікаў, па 3 камісары ў ваяводскія і павятовыя камісіі, што дзейнічалі на тэрыторыі аддзела.

Вызначаны быў адзіны час правядзення выбараў: на асаблівых сходах – 7 красавіка, на агульных – 14 красавіка, на сходах аддзела – 9 мая, з 8 гадзін раніцы кожныя 2 гады. Па некаторых працэдурах сходы мяшчан павінны былі карыстацца правіламі для зямянскіх сеймікаў. Галасаванне па кандыдатурах службоўцаў адбывалася па вуліцах на асаблівых сходах, па акругах – на агульных, па гарадах – на сходах аддзелаў. Намеснікі апеляцый-ных суддзяў не выбіраліся асобна – імі станавіліся тыя, хто набраў большасць галасоў пасля кандыдатаў, выбраных суддзямі.

На асаблівых сходах выстаўляліся пытанні на сейм, якія абагульняліся сходам аддзела для ўпаўнаважаных. Акрамя таго асаблівыя сходы ці агульныя сходы спецыяльна выбраных для гэтага ў акругах гмінных з дазволу камісіі паліцыі маглі прымаць ухвалы аб зборы падаткаў. Упаўнаважаныя, выбраныя на сейм, і дэпутаты на сход аддзела пасля іх заканчэння павінны былі даць справаздачу на адпаведным сходзе: першыя – аб дзейнасці на сейме, другія – аб выбраных на сейм дэпу-татах, апеляцыйных суддзях і пытаннях, накіраваных на сейм.

Пасіўным выбарчым правам не маглі карыстацца асобы, якія не дасягнулі 23 гадоў, раздалі маёмасць крэдыторам, знаходзіліся пад следствам і на дзейснай службе ў войску ці ў зямянскіх урадах, не ўмелі чытаць і пісаць. Таксама нельга было выбіраць у адзін орган бацьку і сына, цесця і зяця, родных братоў. Радцамі, войтамі, бурмістрамі, упаўна-важанымі на сейм, апеляцыйнымі суддзямі і іх намеснікамі не маглі быць тыя, хто да гэтага не займаў пасад у выбарных га-радскіх ці зямянскіх установах. Усе служ-боўцы выбіраліся на 2 гады і маглі пра-цягваць службу далей пры ўмове новых выбараў. Аплата ім устанаўлівалася магіст-ратамі па ўзгадненні з камісіяй паліцыі.

Войт з раднымі ўтваралі магістрат, выбіралі тайным галасаваннем пісара, які меў дарадчы голас і загадваў

канцылярыяй, сіндзіка, які быў прадстаўніком горада. Магістраты сачылі за захаваннем гарадскіх правоў, вызначалі апекуноў сіротам і ўдовам, апякалі бедных і калек, раскладвалі падаткі, рыхтавалі прапановы для рашэнняў сходаў мяшчан, збіралі сходы, кіравалі міліцыяй, загадвалі касай, турмой, магазінамі, шпіталямі, грамадскай маёмасцю, збіралі рапарты ад гарадскіх службоўцаў, самі падавалі рапарты ў вышэйшыя органы ўлады, вызначалі памеры аплаты службоўцам, маглі прыцягваць да адказнасці тых, хто не выконваў іх рашэнні ці рабіў замах на жыццё членаў і слуг магістрата.

Гарадскі войт збіраў магістрат, падпісваў яго рашэнні, кіраваў міліцыяй, даваў даручэнні слугам, мог судзіць бягучыя справы, якія не перавышалі кошт у 50 злотых ці пакарання 12 злотымі. Войт акругі ажыццяўляў нагляд за гарадскімі слугамі, выконваў распараджэнні магістрата і прэзідэнта горада, даваў ім справаздачы і судзіў тыя ж справы, што і гарадскі войт.

Гарадскі суд у складзе бурмістра і 4 суддзяў як суд першай інстанцыі вырашаў без права апеляцыі на прысуд справы да 300 злотых ці з пакараннем да 3 дзён турмы. Па справах ад 300 да 3000 злотых ці па пакараннях звыш 3 дзён і да 3 тыдняў турмы апеляцыя магла накіроўвацца ў апеляцыйны суд аддзела. Пры большых памерах справы і пакарання апеляцыя накіроўвалася ў асэсорыю. Крымінальныя справы адразу накіроўваліся ў апеляцыйны суд аддзела, які з'яўляўся для іх судом першай інстанцыі. Па справах, што ўваходзілі ў паўнамоцтвы камісіі паліцыі, апеляцыя магла накіроўвацца ў гэтую камісію, якая разглядала таксама справы аб зневажанні суда. Гарадскі суд прызначаў сабе нязменных пісара, інстыгатара, а таксама возных.

У абавязкі лаўнікаў (6 у кожнай акрузе і 4 у гарадах, не падзеленых на акругі) уваходзіла выкананне судовых рашэнняў, правядзенне следчых дзеянняў на месцах, аглядаў, выкананне функцыі натарыяту. Касір загадваў гарадской казной, прыходам і расходам гарадскіх грошай, вёў адпаведныя кнігі, штогод здаваў магістрату справаздачу, мог прызначаць сабе намеснікаў і слуг.

Прэзідэнт у гарадах, падзеленых на акругі, выконваў тыя ж функцыі, што і войты ў акругах ці гарадах, якія іх не мелі, з той розніцай, што ў адрозненне ад войта горада ён сам не судзіў, а разглядаў апеляцыі на прысуд акруговых войтаў. Гарадскі суд мог дзейнічаць пры наяўнасці 3 асоб. Апеляцыйны суд, які быў правамоцным пры наяўнасці 3 суддзяў і 3 намеснікаў суддзі, таксама выбіраў сабе нязменнага пісара і карыстаўся пячаткай з выявай герба "Пагоня" і пад ім герба цэнтральнага горада пэўнага аддзела.

Канстытуцыя "Папярэджанне адносна ўвядзення права аб гарадах нашых, даўней каралеўскіх, а цяпер вольных Рэчы Паспалітай" загадвала ва ўсіх гарадах і мястэчках, якія маюць прывілеі locationis, выбраць урады згодна з новым заканадаўствам 1 жніўня 1791 года. Пры гэтым агаворвалася, што раней выбраныя магістраты могуць дзейнічаць да красавіка 1792 года. Сходы аддзелаў павінны былі сабрацца 10 жніўня і выбраць упаўнаважаных на сейм. Гарады, лакацыйныя прывілеі якіх загінулі, маглі звярнуцца да канцлераў з доказамі іх былой наяўнасці, атрымаць ад караля рэнавацыйныя прывілеі і затым выбраць магістраты [8, с. 297–298].

Канстытуцыя "Уладкаванне гарадскіх судоў і асэсорыі" [8, с. 301–312] больш дэталёва разглядала пытанні дзейнасці ўсіх мяшчанскіх судоў: ардынарыйнага першай інстанцыі ці гарадскога (акруговага), войтаўскага паточнага ў гарадах, не меўшых акруг, і войтаўскага паточнага ў акругах, судоў магістратаў па справах паліцыі і эканамічных справах горада, апеляцыйных і крымінальных судоў аддзелаў і асэсорыі ці найвышэйшага апеляцыйнага суда. Кожны суд меў адпа-

ведную пячатку: ніжэйшыя з гербам горада і адпаведнымі надпісамі.

Усе ніжэйшыя і апеляцыйныя суды павінны былі штоквартальна інфармаваць асэсорыю аб агульнай колькасці спраў, аб справах, па якіх дапушчана апеляцыя і аб памеры сабраных судовых пошлін. Вызна-чаліся таксама ўзоры прысяг службоўцаў, тэрміны дзейнасці судоў і судовых кані-кулаў, больш шырока вызначаліся абавязкі пісараў і сіндзікаў. Да таго ж пры радных і суддзях вызначалася такая ж колькасць намеснікаў.

Пры гарадскіх судах павінны былі прызначацца рэгенты – намеснікі пісараў, фіскальны пракуратар па справах бяспекі суда і судовых пошлінах, пракуратар сірот і ўбогіх па адпаведных справах, праку-ратар паліцыі па адпаведных справах, возныя ці гарадскія слугі. Пры апеляцый-ных судах уводзілася пасада адваката аддзела, які сачыў за выкананнем абавяз-каў сіндзікамі, паведамляў генеральнаму адвакату асэсорыі пра дзейнасць магістра-таў і судоў першай інстанцыі, быў абарон-цам па справах сірот, удоў, злачынцаў, удзельнічаў у следстве па крымінальных справах. У судах забаранялася адначасова засядаць таксама стрыечным родзічам. Суддзі не маглі судзіць справы сваіх дзяцей і ўласных спраў, аднак на час іх разгляду не вызваляліся ад сваёй дзейнасці па іншых справах.

Як сведчыць канстытуцыя “Падзел дэпутатаў ад гарадоў вольных – цэнтраў аддзелаў да магістратур урада” з верасня 1791 года, усе аддзелы ВКЛ накіравалі сваіх дэпутатаў у сейм. Упаўнаважаны ковенскага аддзела, крайчы гэтага павета Юзаф Фергіс і ўпаўнаважаны гродзенскага аддзела, прэзідэнт Гродна Юзаф Зялінскі атры-малі месца камісараў камісіі паліцыі абодвух народаў; упаўнаважаны віленс-кага аддзела, прэзідэнт Вільні Даніэль Пашкевіч і ўпаўнаважаны навагрудска-га аддзела, прэзідэнт Навагрудка Ян Генцэль сталі камісарамі камісіі скарбу ВКЛ; упаўнаважаны брэсцкага аддзела, брэсцкі радца Ян Раманоўскі, упаўнава-жаны пінскага аддзела, пісар пінскага магістрата Тэадаровіч, упаўнаважаны мінскага аддзела, мінскі радца Таранке-віч занялі месцы ў асэсорыі [8, с. 300].

Правядзенне ў жыццё гарадскіх рэформаў адлюстроўваюць актавыя кнігі магістратаў. Так у 1792 годзе ў лідскіх кнігах фіксуюцца “ўрад гарадскі першай інстанцыі”, старшынствуючы і суддзі [9, арк. 66, 83]. У Мінску запіс “перад актамі апеляцыйнымі”, а таксама пасада прэзідэнта з’яўляюцца ў верасні 1791 года [10, арк. 249, 260]. Трэба адзначыць, што рэформы закра-нулі не толькі каралеўскія гарады, але і прыватныя. Сведчаннем гэтага можа быць згадка пасады прэзідэнта ў Нясвіжы з 1792 года [11, арк. 1]. Пача-лося ўзаемадзеянне апеляцыйных гара-доў з вольнымі гарадамі іх аддзела. Так брэсцкі магістрат накіраваў свайго дэлегата Базыля Багуслаўскага ў Пру-жаны. У адпаведным запісе актавай кнігі пружанскага магістрата прыгад-ваецца дэпутат Пружанаў на сход аддзела Мікалай Лахоцкі і прынясенне магістратам прысягі на вернасць каралю і Рэчы Паспалітай 25 лютага 1792 года ў час кобрынскага сейміка [12, арк. 10].

Ход рэалізацыі гарадскіх рэформаў добра прасочваецца па актах гродзенскага магістрата. 11 жніўня 1791 года ўжо адбыўся сход аддзела, на якім быў выбраны ўпаўнаважаны на сейм Юзаф Антоні Жылінскі, а таксама аб’яднанае паседжанне сходу аддзела і агульнага сходу Гродна, дзе была падрыхтавана інструкцыя для яго [13, арк. 216–225]. Менавіта Жылінскі і старшынстваваў на сходзе, які адбыўся ў “галоўнай гродзенс-кай ратушы”, у якасці “дырэктара парад-кавага кола”. Асэсарамі былі гродзенскі дэпутат Якуб Рафановіч, ваўкавыскі дэпу-тат Андрэй Васюкевіч, філіпаўскі дэпутат Міхал Кабынік і сімненскі дэпутат Павел

Чаеўскі. Усяго ж на сходзе прысутнічалі ад Гродна 4 дэпутаты, ад Ваўкавыска 1 дэ-путат, ад Філіпава 2 дэпутаты, ад Сімна 2 дэпутаты, ад Мерачы 2 дэпутаты, ад Перарослі 1 дэпутат, ад Бержнікаў 1 дэ-путат, ад Васількава 2 дэпутаты, ад Лаздзеі 2 дэпутаты, ад Мсцібава 1 дэпутат, ад Ліпска 1 дэпутат, ад Адэльска 2 дэпу-таты, ад Новага Двара 2 дэпутаты. Да таго ж на паседжанні, дзе рыхтавалася інструк-цыя, прысутнічалі старшыня гродзенскага апеляцыйнага суда, каралеўскі сакратар Андрэй Францішак Сталінскі, апеляцый-ныя суддзі ашмянскі ротмістр Антоні Савіцкі, гродзенскі ротмістр Ян Сакалоўскі, Пётр Пастольскі, Францішак Крэйбіх, Юзаф Легатовіч, намеснікі апеляцыйных суддзяў Ян Далькоўскі, Юзаф Хонвальт, Юзаф Тамашэўскі і гродзенскі каморнік Антоні Гердзялкоўскі, гродзенскі гарадскі пісар Даніэль Лянкевіч, радца гродзенска-га магістрата Міхал Шнэль, лаўнікі гродзенскага магістрата Ян Тэадор Коп, рэгент цывільна-вайсковай камісіі Ян Канопка, скарбовы дваранін Казімір Бярнацкі, Пётр Губчынскі, Андрэй Вэбер, старэйшы гмінны Юзаф Бараноўскі, гмінныя Тобіяш Гаўсман, Ян Мораш, Мікалай Сусінскі, Готфрыд Крум, Міхал Сакоўскі і Ян Барысевіч.

У інструкцыі адзначалася, што ўпаўнаважаны ў першую чаргу павінен па прыбыцці на сейм выказаць падзяку каралю і сканфедэраваным станам “як усталяваўшым шчасце гарадскога люду”. Таксама ён павінен быў клапа-ціцца пра пацвярджэнне прывілея Гродна на магдэбургскае права 1496 года і ўсіх наступных канфірмацыйных прывілеяў; аб перадачы гораду некаль-кіх дзесяткаў валок зямлі ад эканоміі; вяртанні зямель, лугоў і лясоў па абодвух берагах Нёмана, якія былі адабраны Тызенгаўзам і на якіх, у прыватнасці, размясцілася Гарадніца; аб адмене тых пунктаў дэкрэта асэсорыі па судовай справе паміж горадам і пры-ватнымі землеўладальнікамі, якія супярэчаць інвентару горада, складзе-наму перад Люблінскай уніяй, і іх адпа-веднай карэкціроўцы. Шэраг пунктаў інструкцыі датычыўся ўсіх гарадоў: аб абароне купцоў унутры дзяржавы і за яе межамі, у тым ліку праз заключэнне дагавораў з іншымі дзяржавамі; аб адмене выплат на каморах за замежныя напоі пасля выплаты чопавага; аб выплаце цла і візавага толькі на каморы і 1 раз; аб ажыццяўленні ў гарадах суда па новым грамадзянскім і крымінальным кодэксе; аб сведчанні актаў продажу гарадской маёмасці толькі ў гарадскіх судах; аб прыняцці асобнай ардынацыі для яўрэяў, а да таго часу аб забароне ім утрымання крамаў і гандлю насуперак прывілеям гарадоў; аб прывядзенні ў жыццё зако-наў, у тым ліку пастаноў апеляцыйных судоў, з дапамогай войска; аб прыняцці прапаноў, дадзеных сейму прадстаўні-камі гарадоў. Жылінскі павінен быў наогул падтрымліваць усё, што было б на карысць гарадам, прычым супольна з упаўнаважанымі іншых гарадоў.

У гэты ж час назіраецца актыўная барацьба гарадскіх паселішчаў за вяртанне і набыццё гарадскіх правоў. У актах таго ж гродзенскага магістрата 5 лістапада 1791 года ўнесены даверанасць Антону Кашыц-каму на выпраўленне копій прывілеяў мястэчка Лунна з Метрыкі ВКЛ, а затым і знойдзеныя граматы: размежаванне паміж горадам Лунна і землямі Януша Сапегі 1532 года і канфірмацыі Уладзіслава Вазы і Міхала Вішнявецкага [13, с. 382–384, 426, 429]. Занеслі ў акты апеляцыйнага горада свае рэнавацыйныя прывілеі Пуні, Візайны, Кальварыя, Пеавалка [13, с. 520–525, 544–549, 550–555, 621–628].

У красавіку 1792 года ў Гродне разгарнулася кампанія па выбарах новых органаў самакіравання. Пачалася яна з асаблівых сходаў двух гродзенскіх акругаў. Пачаліся яны 7 красавіка паводле ўнівер-сала 13 сакавіка 1792 года з ратушнага звону і набажэнства ў паезуіцкім касцёле. Як галоўны гарадскі ўраднік распачынаў іх Юзаф Зялінскі з чытання

канстытуцый 18 красавіка і 24 чэрвеня 1791 года. Затым на паседжанні першай акругі былі выбраны дырэктар Андрэй Францішак Сталінскі і асэсары Тадэвуш Клава, Юзаф Тамашэўс-кі, Пётр Пастольскі і Францішак Крэйбіх. Пасля гэтага паседжанне было перанесена на 9 гадзін 9 красавіка па прычыне "пасхальнай суботы". У панядзелак кандыдатамі на пасаду войта былі вылучаны Ян Мароз, Тобіяш Гаўсман і Казімір Абрамовіч. Абраным стаў апошні. Пасля трохразовага абвяшчэння ён прынёс прысягу. Затым былі вылучаны кандыдаты на пасаду лаўніка ў колькасці 6 чалавек, якія былі абраны і прынеслі адпаведную прысягу. Па прычыне адсутнасці кандыдатаў на пасаду бурмістра і суддзяў паседжанне было перанесена на 10 красавіка. Назаўтра былі вылучаны 5 кандыдатаў у суддзі і 1 кандыдат у бурмістры (Тэадор Коес). Суддзі выбіраліся большасцю галасоў. Пры роўнасці галасоў карткі з імёнамі кандыдатаў клаліся ў "вазон", адкуль адну выцягвала дзіця. Па прыведзенай у акце колькасці пададзеных за кандыдатаў галасоў "за" і "супраць" можна меркаваць, што на сходзе прысутнічала 80 чалавек. 11 красавіка адбыліся выбары намеснікаў суддзяў у колькасці 4 (бо пасля выбараў суддзяў засталася толькі адна кандыдатура), 15 гмінных. Якуб Гаўсман, Антон Гулінэцці і Пётр Губчынскі былі выбраны ў цывільна-вайсковыя камісіі [13, с. 673–680]. У гэты ж тэрмін адбыліся выбары ў другой акрузе, але няпоўны запіс не дазваляе вызначыць імёны і прозвішчы ўраднікаў гэтай акругі.

Больш драматычна склаліся выбары на агульным сходзе. Гмінныя раскалоліся на дзве партыі, якія імкнуліся правесці на асноўныя пасады свае кандыдатуры. Выбары адбыліся 15 красавіка. Рэзалюцыю схода засведчылі судовы інстыгатар Гродна Стэфан Забэла і адвакат гродзенскага аддзела, браслаўскі каморнік Павел Жулевіч. У першы дзень праз галасаванне "каляровымі галкамі" былі выбраны дырэктар схода Міхал Эрэнкрэйц, асэсары Ян Вэбер, Юзаф Пашкоўскі, Антоні Кульфан і Павел Кавалеўскі, якія прынеслі прысягу адпаведна з канстытуцыяй праз зямянскія сеймікі. На наступны дзень з 9 кандыдатаў было выбрана большасцю галасоў 8 радных, з іх аднагалосна прэзідэнтам – Тадэвуш Клава, а віцэ-прэзідэнтам – Якуб Рафановіч. Касірам з двух кандыдатур быў прызначаны Францішак Крэйбіх, паколькі Ваўжынец Бары-севіч зняў сваю кандыдатуру да галасавання. Галасаванне адбывалася тайна: карткі клалі ў спецыяльнае "начынне", адкуль іх даставалі дзеці [13, с. 702–718].

У 1792 годзе працягвалася барацьба гарадоў з эканоміяй за свае правы. Прыведзеныя ў гродзенскіх актах мандаты Ліпска, Мастоў, Адэльска даз-валяюць сцвярджаць, што ў іх таксама былі створаны органы самакіравання ў адпаведнасці з новым правам: войт і 4 радных, бурмістр і 4 суддзі, іх намеснікі і пісар, а таксама сіндзікі, адпаведна Павел Хільмонік, Марцін Дэрсан, Рамуальд Шумінскі, якія ўласна і займаліся судовымі справамі з адміністратарам [13, с. 720–728, 765–768, 793]. 15 мая 1792 года сваю скаргу на эканомію ў акты Гродна занеслі і мяшчане Скідзеля [13, с. 811].

Спынілася правядзенне рэформаў у сувязі з дзеяннямі Таргавіцкай канфедэ-рацыі. Аднак яны пакінулі ў мяшчанскім асяроддзі трывалы след. Так, калі С. Ка-сакоўскі звярнуўся да полацкіх мяшчан з патрабаваннем прадставіць бурмістраў, яму адказалі, што па новым законе ў горадзе прэзідэнт і радцы. Гараджане Дзісны не прысягалі канфедэрацыі аж да 28 верасня і працягвалі кіраваць горадам у адпаведнасці з новым заканадаўствам [5, с. 196, 197]. Лідскія мяшчане ў час паўстан-ня пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі скардзі-ліся ў цэнтральную дэпутацыю літоўскага народа на дзеянні пратаргавіцкага магістрата і патрабавалі вярнуць той склад гарадскога самакіравання, які быў

выб-раны згодна з рэформамі Чатырохгадо-вага сейма, аднаўлення канстытуцыі 3 мая і іншых законаў [9, арк. 109–110 адв].

**Заключэнне.** Такім чынам, рэформы Чатырохгадовага сейма неслі істотныя змены ў структуры і функцыі гарадскога самакіравання. Упершыню з'явілася адзінае для усёй краіны гарадское заканадаўства, якое прыйшло на змену партыкулярызму магдэбургскага права. Былі ўсталяваны адзіныя правілы ўтварэння і функцыянавання інстытутаў гарадскога самакіравання. Больш дакладна размяжоўваліся напрамкі іх дзейнасці. Змяняліся заканадаўчыя асновы судовага працэсу. Ажыццяўляўся новы адмініст-рацыйны падзел гарадоў на акругі і дазоры, утвараліся гарадскія аддзелы з цэнтрамі ў апеляцыйных гарадах. Пачалося пэўнае ўключэнне гарадскіх інстытутаў у агульную структуру улады Рэчы Паспалітай з акрэсленым абмежа-ваннем функцый у галіне кіравання і суда, падначаленнем іх дзяржаўным органам кіравання (камісіі паліцыі, скарбовай камісіі, асэсорыі). Пашы-рэнне правоў гараджан выклікала рост іх самасвядомасці.

## Літаратура


1. Атрушкевич, М.М. Городские реформы в Белоруссии во второй половине XVIII – первой половине XIX в.: учеб. пособие / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Мінск: БГПУ, 1999. – 67, [1] с.
2. Атрушкевич, М.М. Общая характеристика норм магдебургского права в белорусских городах во второй половине XVIII в. / М.М. Атрушкевич // Актуаль-ныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР: матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 27 лют. 2009 г.) / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: А.І. Андарала [і інш.]: у 2 ч. – Мінск: БДПУ, 2009. – Ч. 1: Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да 1918 г. – С. 72–77 с.
3. Gordzejew, Jerzy. Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe w Wielkim Księstwie Litewskim w okresie Siejmu Czteroletniego (1789–1792) / Jerzy Gordzejew. – Kraków: Wydawnictwo uniwersitetu Jagellonskiego, 2010. – 352 s.
4. Стрэнкоўскі, С.П. Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII стагоддзя: манаграфія / С.П. Стрэнкоўскі. – Мінск: МГІРА, 2008. – 251 с.
5. Glemza, L. Lietuvos Didziosios Kunigaikstystes miestu sajudis 1789–1792 metais / L. Glemza. – Kaunas, 2010. – 264 s.
6. Стрэнкоўскі, С.П. Самакіраванне Мінска ў XVI–XVIII стст. як арганізацыйная культура / С.П. Стрэнкоўскі // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права): матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 вер. 2009 г. / рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – С. 15–23.
7. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 344 с.
8. Volumina legum. – Kraków: nakładem Akademii umiejętnośći, 1889. – T. 9. – 503 s.
9. НГАБ. – Фонд 1718. – Воп. 1. – Сп. 4. Актавая кніга Лідскага магістрата.
10. НГАБ. – Фонд 1816. – Воп. 1. – Сп. 18. Актавая кніга Мінскага магістрата.
11. НГАБ. – Фонд 1819. – Воп. 1. – Сп. 8. Актавая кніга Нясвіжскага магістрата.
12. НГАБ. – Фонд 1827. – Воп. 1. – Сп. 12. Актавая кніга Пружанскага магістрата.
13. НГАБ. – Фонд 1761. – Воп. 1. – Сп. 15. Актавая кніга Гродзенскага магістрата.


*Паступіла ў рэдакцыю 24.08.2011 г.*

*Прынята ў друк 12.12.2011 г.*